## 17 чэрвеня – 100 гадоў з дня нараджэння М. М. Яроменкі (1926–2000), акцёра тэатра і кіно, народнага артыста Беларусі і СССР

Творчы шлях Мікалая Мікалаевіча Яроменкі быў адзначаны поспехам і любоўю гледачоў. Ён выканаў вялікую колькасць роляў на тэатральнай сцэне і ў кіно. Вобразы, створаныя акцёрам, насычаны псіхалагічным зместам, выразнай пластыкай, майстэрствам пераўвасаблення.

Нарадзіўся М. Яроменка ў Новасібірску. Пасля заканчэння васьмі класаў паступіў у рамеснае вучылішча. Некаторы час працаваў токарам на заводзе. Калі пачалася Вялікая Айчынная вайна, змяніў дату нараджэння на 1923 г. і паступіў у ваеннае вучылішча. Праз тры месяцы быў накіраваны на Калінінскі фронт. Летам 1942 г. у баях пад Вязьмай атрымаў раненне і трапіў у палон. Амаль тры гады (па май 1945 г.) знаходзіўся ў розных канцэнтрацыйных лагерах.

У снежні 1945 г. М. Яроменка прыехаў у Бешанковічы, дзе жылі яго маці і сястра. Ён стаў кіраўніком раённага дома культуры. У пачатку 1946 г. на абласным аглядзе мастацкай самадзейнасці ў Віцебску таленавітага юнака заўважыў вядомы артыст А. Ільінскі, які запрасіў яго ў драматычную студыю пры Другім беларускім дзяржаўным тэатры імя Якуба Коласа (БДТ-2), дзе выкладалі акцёры П. Малчанаў, Ц. Сяргейчык, Л. Мазалеўская, А. Радзялоўская і інш. У час вучобы М. Яроменка настойліва працаваў над голасам, пластыкай, на практычных занятках імкнуўся авалодаць сакрэтамі сцэнічнага майстэрства. Пасля заканчэння студыі ў 1948 г. быў залічаны ў трупу БДТ-2. Ён сыграў шмат розных роляў у гэтым тэатры, у кожную з якіх імкнуўся прыўнесці свой жыццёвы вопыт, узбагаціць індывідуальнымі рысамі. Яркай старонкай у творчай біяграфіі М. Яроменкі сталі вобразы актыўных і валявых герояў, такіх як Інсараў («Напярэдадні» паводле І. Тургенева), Азорыч («Свята з Усходу» П. Глебкі), Грэкаў («Ворагі» М. Горкага), Максім Ножкін («Сумленне» Ю. Чапурына), Віктар Патапенка («Андрэй Лабанаў» паводле Д. Граніна), Аляксандр Грачоў («Пачатак жыцця» К. Фіна), Бальшакоў («Шчасце» І. Дорскага), Бахіраў («Бітва ў дарозе» паводле Г. Нікалаевай) і інш. Гэтыя ролі прынеслі акцёру папулярнасць, прызнанне крытыкі, павагу ў калектыве. За плённую сцэнічную працу ў Коласаўскім тэатры М. Яроменку ў 1955 г. было прысвоена званне заслужанага артыста БССР.

У 1959 г. акцёра запрасілі ў трупу Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы. Самабытнае артыстычнае дараванне, багаты духоўны свет, паслядоўнасць і прынцыповасць жыццёвых пазіцый дазволілі М. Яроменку стварыць шырокую галерэю вобразаў на купалаўскай сцэне. Ён сыграў дзясяткі розных роляў – галоўных і эпізадычных, характарных і гумарыстычных. У кожнай з іх імкнуўся адлюстраваць індывідуальнасць свайго героя, раскрыць яго характар. Сярод найбольш запамінальных і вядомых – Міканор («Людзі на балоце» паводле І. Мележа), Чубар («Плач перапёлкі» І. Чыгрынава), Марозаў («Уцёкі з начы» бр. Тур), Саламахін («Пратакол аднаго пасяджэння» А. Гельмана), Нікіцін («Бераг» паводле Ю. Бондарава). Глыбокім псіхалагізмам і майстэрствам пераўвасаблення вызначаўся вобраз Канстанціна Заслонава ў спектаклі па аднайменнай драме А. Маўзона. Ён быў прасякнуты высокім грамадзянскім пафасам, імкненнем чалавека да свабоды, якое нельга падавіць ні жорсткасцю акупацыйнага рэжыму, ні нават смерцю. Сярод сатырычных вобразаў – чыноўнік-прыстасаванец Рыгор Мурын («Без віны вінаватыя» А. Астроўскага), кар'ерыст Скараспей («Брама неўміручасці» К. Крапівы), мешчанін Нібыарлоў («Стары Новы год» М. Рошчына), міністр узгадненняў Вяршыла («Мудрамер» М. Матукоўскага, Дзяржаўная прэмія Беларусі, 1988 г.). Вяршыняй тэатральнай творчасці сталі апошнія ролі – сэр Джон («Касцюмер» Р. Харвуда, адзначана ў 1998 г. прызам і дыпломам Міжнароднага славянскага фестывалю) і Бернард Шоу («Мілы лгун» Дж. Кілці, спектакль быў пастаўлены ў 1998 г. у Тэатры-студыі кінаакцёра).

Вялікую папулярнасць набыў М. Яроменка і як кінаакцёр. Ён дэбютаваў у фільме «Наперадзе круты паварот» (1960), дзе сыграў следчага Радзевіча. Сапраўдны поспех прынесла артысту галоўная роля ў мастацкім фільме С. Герасімава «Людзі і звяры» (1962). У вобразе савецкага афіцэра Аляксея Паўлава, чалавека складанага і трагічнага лёсу, М. Яроменка праўдзіва перадаў тое, што перажыў сам у гады вайны. Пасля гэтага фільма ён шмат здымаўся. Акцёр выканаў звыш 50 кінароляў, сярод якіх – бацька Вані («Іван Макаравіч», 1968), рэвалюцыянер Ваулін («Крушэнне імперыі», 1970), начальнік міліцыі («Амністыя», 1980) і інш. У 1995 г. на экраны выйшла кінакарціна «Сын за бацьку», дзе М. Яроменка сыграў загадчыка паліклінікі Аляксандра Мікалаевіча, за гэтую ролю атрымаў прыз і дыплом на Міжнародным кінафестывалі «Залаты Віцязь» (Славуціч, Украіна, 1996); у 1997 г. – Гран-пры Першага нацыянальнага фестывалю беларускіх фільмаў, які адбыўся ў Брэсце.

Шмат гадоў М. Яроменка сумяшчаў творчую работу з грамадскай дзейнасцю. Ён кіраваў Беларускім тэатральным аб'яднаннем (1976–1987), Саюзам тэатральных дзеячаў Беларусі (1987–1992), быў прэзідэнтам Беларускай канфедэрацыі творчых саюзаў (з 1992 г.). Некаторы час узначальваў Савет прэзідэнцкага фонду матэрыяльнай дапамогі маладым талентам, з'яўляўся членам Савета Рэспублікі першага склікання, намеснікам Старшыні Пастаяннай камісіі Савета Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь. За заслугі ў развіцці тэатральнага і кінамастацтва М. Яроменку ў 1964 г. было прысвоена ганаровае званне народнага артыста БССР. У 1989 г. ён стаў народным артыстам СССР. Акцёр узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны II ступені (1985). У 1996 г. атрымаў медаль Ф. Скарыны, у 2000 г. – спецыяльны прыз Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.


**Яроменка Мікалай Мікалаевіч** // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. – Мінск, 2004. – Т. 18, кн. 1. – С. 302–303.

**Ерёменко Николай Николаевич** // Республика Беларусь : энциклопедия : [в 7 т.]. – Минск, 2006. – Т. 3. – С. 503.

**Яроменка Мікалай Мікалаевіч** // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. – Мінск, 2003. – Т. 6, кн. 2. – С. 305.

**Яроменка Мікалай Мікалаевіч** // Культура Беларусі : энцыклапедыя : [у 6 т.]. – Мінск, 2015. – Т. 6. – С. 480.

**Яроменка Мікалай Мікалаевіч** // Тэатральная Беларусь : энцыклапедыя : у 2 т. / пад агульнай рэдакцыяй А. В. Сабалеўскага. – Мінск, 2003. – Т. 2 – С. 560–561.

**Еременко Николай Николаевич** // Современное искусство Республики Беларусь : справочник персоналий / Министерство культуры Республики Беларусь, Учреждение образования «Белорусский государственный университет культуры и искусств» ; составители: В. П. Прокопцова [и др.]. – Минск, 2018. – С. 128–129.

**Еременко-ст. Николай Николаевич** // Белорусское кино : персоналии / Национальная киностудия «Беларусьфильм» [и др.] ; автор концепции, составитель и научный редактор О. Нечай. – Минск, 2007. – С. 121–122.

**Ерёменко Николай Николаевич (1926–2000)** // Белорусы, прославившие Россию. Россияне, прославившие Беларусь / Постоянный комитет Союзного грсударства ; автор текста А. А. Звозников. – 2-е изд., исправленное и дополненное. – Минск, 2011. – С. 24–25.

**Смольскі, Р. Б.** Творца і грамадскі дзеяч: вопыт асэнсавання гісторыі аднаго лёсу : (да 90-годдзя з дня нараджэння народнага артыста СССР і БССР Мікалая Мікалаевіча Яроменкі) / Смольскі Р. Б. // Дзяржава і творчая асоба : матэрыялы VII Рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі, 22 красавіка 2016 г. / Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў ; рэдкалегія: С. П. Вінакурава (старшыня) [і інш.]. – Мінск, 2016. – С. 11–18.

**Мікалай Яроменка (1926–2000)** // Хрэстаматыя па гісторыі беларускага тэатра і драматургіі : у 3 т. / Беларускі ўніверсітэт культуры ; укладанне, рэдакцыя тэкстаў, уступныя артыкулы і каментарыі А. В. Сабалеўскага. – Выд. 2-е, пашыранае і ўдакладненае. – Мінск, 2000. – Т. 3 : 60-я гады XX стагоддзя – 2000 год. – С. 389–395.

**Николай Еременко.** А свет не погас… : очерки, монологи, воспоминания / составитель Л. Екель. – Минск : Мастацкая літаратура, 2006. – 254, [1] с. : ил. – (Жизнь знаменитых людей Беларуси).

**Орлова, Г. А.** Три я / Галина Орлова, Леонид Янкель. – Минск : Журналистский фонд Белорусского союза журналистов, 1996. – 95 с., [8] л. фот. – (Творцы).

**Сохар, Ю. М.** Мікалай Яроменка / Ю. М. Сохар // Тэатральныя пуцявіны : мастацтвазнаўчыя артыкулы, рэцэнзіі, творчыя партрэты / Ю. М. Сохар. – Мінск, 2003. – С. 416–420.

**Прыгодзіч, З. К.** Чалавек можа ўсё / Зіновій Прыгодзіч // Трывожная памяць / Зіновій Прыгодзіч. – Мінск, 2020. – С. 342–359.

**Пригодич, З. К.** Николай Еременко: «Я не умею жить для себя…» / Зиновий Пригодич // Созидатели / Зиновий Пригодич. – Минск, 2019. – С. 139–176.